# З’ЯВЫ НАДВОР’Я Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ ВА ЎСПАМІНАХ ФЁДАРА ЕЎЛАШЭЎСКАГА

***К. Дз. Даўматовіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, kirill28. 02@mail. ru*

З’явы надвор’я – гэта значная частка жыцця любога чалавека. Надвор’е праз усю гісторыю так ці інакш мела ўплыў на жыццё людзей. Тым не менш, для гісторыкаў складанай задачай з’яўляецца рэканструкцыя прыродных з’яў у той ці іншы час. Гэта праблема звязана перш за ўсе з недахопам адпаведных крыніц, таму калі некаторыя гістарычныя крыніцы маюць звесткі пра з’явы надвор’я, яны дапаўяюць нашы гістарычныя веды пра пэўны перыяд. Такой цікавай гістарычнай крыніцай з’яўляецца Дзённік (Дыярыуш) шляхціца Вялікага Княства Літоўскага (*далей – ВКЛ*) Фёдара Еўлашэўскага. Мэта дадзенага артыкула – адлюстраванне з’яў надвор’я ва ўспамінах Ф. Еўлашэўскага.

***Ключавыя словы:*** з’явы надвор’я; Вялікае Княства Літоўскае; успаміны; Фёдар Еўлашэўскі

# PHENOMENA OF WEATHER IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE MEMOIRS OF FYODOR EVLOSHEVSKY

***K. D. Daumatovich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, kirill28. 02@mail. ru*

Phenomena of weather are a significant part of any person's life. Throughout history, weather has influenced people's lives in one way or another. However, for historians, it is a difficult task to reconstruct natural phenomena at one time or another. This problem is primarily associated with the lack of certain sources, therefore, if some historical sources have information on the manifestation of nature, then they complement our historical knowledge about the indicated period. Such an interesting historical source is the Diary with the memoirs of the nobleman of the Grand Duchy of Lithuania Fyodar Evloshevsky. The purpose of this article is to illustrate weather phenomena in the memoirs of F. Evloshevsky.

***Key words:*** phenomena of weather; Grand Duchy of Lithuania; memories; Fyodar Evloshevsky

Фёдар Міхайлавіч Еўлашэўскі (1546–1619) быў шляхціцам Наваградскага павета, пэўны час займаў пасаду падсудка мясцовага земскага суда. Таксама Фёдар Еўлашэўскі выбіраўся паслом на соймы Рэчы Паспалітай. Аднак, перш за ўсё, гэтая асоба вядома сваімі ўспамінамі, запісаннымі недзе ў 1603–1604 гг. [1, с. 216–217; 2, с. 241–242; 9, с. 1098–1108, 1145; 11, с. 171–172]. Менавіта літаратурная спадчына Фёдара Еўлашэўскага цікава нам з пункту гледжання з’яў надвор’я ў ВКЛ, якія адлюстараваў аўтар і якія могуць дапоўніць нашы веды пра гісторыю

пэўнага часу. Адзначым, што з'явы надвор'я перадаюцца намі тэматычна, а не храналагічна, як запісана ў Ф. Еўлашэўскага.

Федар Еўлашэўскі ва ў сваіх успамінах згадвае з'явы надвор'я, якія адносяцца да громавых і маланкавых [8, с. 57]. Так, прыкладна паміж траўнем і ліпенем 1575 г., калі «едучи до Брестя, пред Полюбичами былем в великом страху *от грому* [вылучана намі – К. Д.], же муселисмы под частыми срокгими перунами [маланкамі – К. Д.]» [4]. Далей Фёдар успамінае, што па прыезду ён са сваім суразмоўцам прыпомніў гэты страх ад грома: «а меновите липца 24, о неделю, а межи иншими розмовами припоминалем тот страх *громовый* [вылучана намі – К. Д.], якосмы се натерпели» [4]. Пры гэтым суразмоўца Фёдара таксама ўспамінае страшэнны гром, які некалі адбыўся ў Кракаве: «он на то поведил, же му еще молодому в Кракове от якогось переежучого кгвяздара практыковано, же мел меть смерть от *грому* [вылучана намі – К. Д.] в року живота его шестдесятым» [4]. Тым больш, Фёдар Еўлашэўскі далей на старонках сваіх успамінаў піша наступнае: «А по тых розмовах и розеханю нашом в десети днях, меновите серпня 4 дня, в четверть, того пана мостовничого *гром* [вылучана намі – К. Д.] забил в полю, под сосною, под которою был, для дощу подехавши, станул» [4]. Чарговы раз падобныя з'явы ўзгадваюцца пад 1585 г. Ф. Еўлашэўскі апавядае пра пажары вызваныя маланкай («Мая 26 перун [маланка – К. Д.] замок на Мыши запалил, который барзо прудко згорел; тогож дня, а подобно в одной године, ударил перун [маланка – К. Д.] в дворе моем у сырницу и голубинец, але не запалил и не забил ничого: дитя туж было и голубята в голубницу») [4]. Дарэчы, падобныя падзеі на ўсходзе ВКЛ у сярэдзіне 1580-х гг. адзначаюцца ў Баркулабаўскім летапісе: «…сил(ь)ный и великий гром забил 12 человек… перуны и грады великия, сухость, морозы маль не через все лето были у Литве… многия домы панов зацных от перунов великих погорели» [5, с. 299; 6, с. 53–54]. Такім чынам, гром і маланка ва ўспамінах Фёдара Еўлашэўскага, як і на старонках летапісу, асацыяваліся перш за ўсе са страхам, смерцю і стратамі. Гэта звязана, па-першае, з тым, што па сюжэтах так ці інакш гром злучаўся з нягодамі, а, па-другое, ужыванне тэрміна «перун» магло быць звязана з негатыўным стаўленнем аўтара-хрысціяніна да язычніцтва. Таксама адзначым, што ў дадзеным выпадку, пры выкарыстанні ўспамінаў і Баркулабаўскага летапісу, можна гаворыць, што недзе ў 1585 г. у ВКЛ надвор'е было вельмі няўстойлівым.

Фёдар Еўлашэўскі таксама адлюстраваў з'явы, звязанныя з вадой і зімой [8, с. 58]. Аўтар піша пра тое, што 8 лютага 1575 г. «воды в том року

на весне гвалтовные были» [4]. Успамінаючы «воды гвалтовные», маецца на ўвазе таенне льдоў і снегу, якія таксама засталіся ва ўспамінах з прычыны трагічных падзей. Адзначым, што аўтарам месцамі падкрэсліваецца і зменлівасць зімы. Так, у 1583 г., калі «под кгромницу зима се постановила моцно по первших неуставичностях» [4]. У гэты раз Федар Еўлашэўскі паказвае пахаладанне ў лютым («зима …моцно»). Пры гэтым па ходу апавядання дадзеная падзея звязваецца са смерцямі пэўных людзей [4]. Прыкладна да гэтага часу ў Баркулабаўскім летапісе адзначаецца, што «… морозы маль не через все лето были у Литве. От великого морозу на поли у колосьи жито посохло… зиме з морозов и метелицы по дорогам многое множество людей убогих, а также и купецких померло» [5, с. 299; 6, с. 53]. Іншы выпадак Фёдар паказаў пад 1585 г.: «зима была барзо тепла; быдло на поли бывало и волы тучоно» [4]. Калі дадаць звестак з летапісу, то да наступнага 1586 г. «был урожай великий, добрый…» [5, с. 301]. Добры ураджай можа з'яўляцца наступствам цёплай зімы. Цёплую зіму Ф. Еўлашэўскі таксама адзначае і ў 1592 г.: «яко з осени, так и от нового лета не докучали зимна и снегов не было, и была то зима праве безснежна; колами вси ездили» [4]. Пры гэтым, у Баркулабаўскім летапісе пад 1592 г. адзначаецца, што той год «был урожа(й)ный», негледзячы на тое, што у тым жа годзе летапісец піша «была брань великая, вел(ь)ми страшная… немало збожа попсовала град и буря великая», але на ўраджай магла паўплываць як раз цёплая зіма [5, с. 313]. Ужо пад 1594 г. Фёдарам апавядаецца пра кепскае надвор'е: «в пяток, припала хмара сродзе зимна, спустила снег великий и лежал три дни; померзло от той хмары и зимна и ветру гвалтовного сила людей, по трою индей веспол, а немогли собе помочи» [4]. Падкрэслім, што пры выкарыстанні успамінаў Ф. Еўлашэўскага і іншых крыніц у нейкай ступені можна казаць пра ўплыў з'яў надвор'я на эканамічны стан некаторых тэрыторый ВКЛ. Таксама адзначым, што параўноваючы звесткі мемуарыста с дадзенымі Баркулабаўскага летапісу відавочна, што некаторыя прыродныя з'явы маглі адбывацца альбо толькі на захадзе, альбо толькі на ўсходзе, што характэрна і для сучаснасці.

Адзіны раз Фёдар Еўлашэўскі згадвае пра астранамічныя з'явы. Так, прыкладна ў 1577 г. «В месецы лютым указала се была *комета* [вылучана намі – К. Д.] велика на зимным восходе сонца и была час не малый» [7, с. 45]. Пры гэтым па дадзеных беларускага даследчыка Дз. Скварчэўскага ўзгаданая Ф. Еўлашэўскім камета была відна ў Еўропе ў 1578 г. [8, с. 55]. Гэтая нявялічкая памылка аўтара дзённіка можа звязвацца з чалавечым

фактарам, але тым не менш пасля гэтай з’явы і напісаннем тэкста прайшло больш за 20 годаў, што можа нават паказваць і пэўную дакладнасць Ф. Еўлашэўскага [10].

Такім чынам, дзённік Фёдара Еўлашэўскага можа так ці інакш сведчыць пра з’явы прыроды ў ВКЛ, асабліва, пры выкарыстанні дадатковых крыніц. Пры аналізе стаўлення аўтара да гэтых падзей можна падкрэсліць негатыўную афарбоўку значнай часткі ўзгаданых прыродных з’яў (узгадваюцца найчасцей сумесна са смерцю і стратамі). У сваю чаргу, гэты фактар можа скласці пэўны псіхалагічны партрэт аўтараў пачатку XVII ст. Таксама звесткі пра з’явы надвор’я паказваюць у некаторай ступені ўплыў клімату на эканамічны стан пэўнай тэрыторыі. Падкрэслім, што літаратурны твор Фёдара Еўлашэўскага з’яўляецца цікавай гістарычнай крыніцай, якая дапаўняе гісторыю Вялікага Княства Літоўскага.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Вілімас Д. Службоўцы павятовых земскіх судоў Вялікага Княства Літоўскага ў 1566–1588 гг. (першае пакаленне павятовых шляхетскіх юрыстаў) // ARCHE. Пачатак. Гісторыя старажытнага Навагрудка. Мн.: ААТ «Мажайскі паліграфічны камбінат», 2016. 2 (147). С. 209–240.
2. Вілімас Д. Тастамент новагродскага земскага суддзі Яраша Еўлашэўскага (1578–1619) // ARCHE. Пачатак. Гісторыя старажытнага Навагрудка. Мн.: ААТ «Мажайскі паліграфічны камбінат», 2016. 2 (147). С. 241–260.
3. Грицкевич В. С факелом Гиппократа: Из истории белорусской медицины. Минск: Наука и техника, 1987. 270 с.
4. Дневник Федора Евлашевского [Электронный ресурс] // Средневековые исторические источники Востока и Запада. URL: http://www. vostlit. info/Texts/rus17/Evlasevskij_Fedor/text. phtml?id=13047. Дата доступа: 09. 08. 2021.
5. Летапісы і хронікі Вялікага Княства Літоўскага (XV–XVIIстст.) / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Філ. «Ін-т мовы і літ. Імя Якуба Коласа і Янкі Купалы»; В. А. Чамярыцкі [і інш.]. Мінск: Беларуская навука, 2015. 479 с.
6. Ліцкевіч А. Клімат старажытнай Беларусі // Беларуская думка. 2008. № 10. С. 52–57.
7. Скварчэўскі Д. Астранамічная тэрміналогія ў літаратуры Вялікага Княства Літоўскага XV–XVII стст. // Журнал Белорусского государственного университета. История. 2017. № 2. С. 42–47.
8. Скворчевский Д. Природные явления, необычные происшествия и мифологические представления на страницах белорусской мемуарной литературы XVI–XVII вв. // Белорусская Магония: странное и загадочное в дореволюционной белорусской печати. Материалы конференции (г. Минск, 18 ноября 2017 года). Минск: Регистр, 2018. С. 52–74.

9. Улашчык М. Збор твораў: у 3-х тамах. Том 1: Працы па археаграфіі і крыніцазнаўству / пад рэд. Д. В. Віцько[і інш.]; прадм. А. К. Каўкі. Смаленск: Інбелкульт, 2017. 1360 с.

10. Хальбвакс М. Коллективная и историческая память [Электронный ресурс] // Неприкосновенный запас, № 2, 2005. URL: https://magazines. gorky. media/nz/2005/2/kollektivnaya-i-istoricheskaya-pamyat. html. Дата доступа: 09. 08. 2021.

11. Ходзін С. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі: дапаможнік. Мінск: БДУ, 2012. 255 с.